принималось никаких попыток создать атомную бомбу», (В. Гейзенберг, 1954 год), [4, 330] – не более чем фальшивая исповедь проигравшихся игроков.


1. Дзелепи Э. Секрет Черчилля. – М. Прогресс, 1975
2. Иойрыш А. И., Морохов И. Д. Хиросима. – М.: Атомиздат, 1979
3. Александров А. П. Щит Родины // За рубежом. – 1979. – № 7
4. Гейзенберг В. Физика и философия. Часть и целое. – М.: Наука, 1990
5. Шпеер А. Воспоминания. Пер. с нем. И. В. Розанова. – Смоленск: Русич, М.: Прогресс, 1997
6. Нюрнбергский процесс. Сб. материалов в 8-ми томах / Отв. ред., автор предисловия Рекунков А. М. – М.: Юридическая литература. Т. 7
7. Ирвинг Д. Вирусный флигель. – М.: Атомиздат, 1969
8. Юнг Р. Лучи из пепла. – М.: Иностранная литература, 1962
9. Гоудсмит С. Миссия «Алсос». – М.: Госатомиздат, 1962
10. Кларк Р. Рождение бомбы. – М.: Госатомиздат, 1962
11. Гровс Л. Теперь об этом можно рассказать. – М.: Атомиздат, 1964



**Малыхіна Л. Ю. (**БрДТУ, г. Брэст)


## БРЭСЦКІ МІР 1918 г. У ЛЁСЕ БЕЛАРУСКАГА НАРОДА

Несправядлівы падзел этнічнай тэрыторыі Беларусі па Брэсцкаму дагавору і разгон Першага Усебеларускага кангрэса ў снежні 1917 г. Мінскім гарнізонам ад імя Савета народных камісараў Заходняй вобласці і фронту істотна змянілі настроі дзеячаў беларускага нацыянальнага руху. Пад вырашальным уплывам гэтых фактараў яны ўсвядомілі, што бараніць цэласнасць і непадзельнасць сваёй Айчыны ім давядзецца самастойна, не разлічваючы на дапамогу Савецкай Расіі, якая была зацікаўлена выратаваннем бальшавіцкай улады любымі сродкамі і ахвярамі ў карысць суседніх краін, якія прэтэндавалі на беларускую этнічную тэрыторыю. Беларускім гісторыкам неабходна раскрыць у адзіным кантэксце гісторыю падрыхтоўкі і падпісання міру ў Брэст-Літоўску і абвяшчэння першага беларускага ўрада, якія супадалі храналагічна і былі ўзаемаабумоўлены.

Прынята лічыць, што грабежніцкія ўмовы названага дагавору сталі следствам зрыву расійска-германскіх перамоваў наркамам замежных спраў РСФСР Л. Д. Троцкім. Сапраўды, сітуацыя магла скласціся для Беларусі іншым чынам. 22 снежня 1917 г. у Брэст-Літоўску пачала працу мірная канферэнцыя, і ужо 28 снежня старшыня германскай дэлегацыі Р. фон Кюльман уручыў савецкаму боку аўстра-германскія ўмовы міру, па якіх ад Расіі адрываліся Польша, Літва, Курляндыя, частка Эстоніі і Ліфляндыі, якія пераходзілі пад пратэктарат Германіі. Мір, заключаны на гэтай стадыі перамоў, мог адвесці ад беларускага краю пагрозу акупацыі тэрмінам у год. Але ж праз тры тыдні – 18 студзеня ўпершыню прагучала патрабаванне аддзяліць ад РСФСР яшчэ і значную частку Беларусі. Ад Расіі ў такім выпадку адыходзілі тэрыторыі агульнай плошчай больш 150 тыс. кв. км.

Сярод бальшавікоў і эсэраў разгарнулася ўнутрыпалітычная барацьба па пытанню: заключаць дагавор на такіх анэксіённых і эканамічна цяжкіх для Расіі ўмовах ці не. Выказанае пры галасаванні сярод членаў ЦК РКП(б) 21 студзеня рашэнне У. І. Леніна – не адцягваючы заключыць мір – пяць разоў большасцю не падтрымлівалася. Больш спрыяльнай ім здавалася прапанова Л. Д. Троцкага спыніць ваенныя дзеянні без падпісвання анексіённага міру з Германіяй і яе саюзнікамі. Гэтая пазіцыя, падтрыманая большасцю галасоў, і была агучана на перамовах 10 лютага, а 16 лютага Германія заявіла аб узнаўленні ваенных дзеянняў. Новы германскі ўльтыматум патрабаваў ад Расіі акрамя пералічаных раней тэрыторый не толькі аддаць поўнасцю Эстляндыю, Ліфляндыю (сучасныя Эстонія і Латвія), яшчэ большую частку Беларусі, але і вывесці Чырвоную Армію з Украіны і Фінляндыі. Усяго краіна Саветаў губляла каля 1 млн. кв. км. Гісторыя паказала, што рана ці позна пытанне аб самавызначэнні пералічаных тэрыторый ў Прыбалтыцы зноў паўстала б, вось толькі лёс беларускіх зямель ад прынятага Троцкім рашэння не змяніўся – яна ў любым выпадку падзялялася на часткі.

Адначасова з перамовамі ў Брэст-Літоўску надзвычайная сітуацыя разгортвалася яшчэ ў адным з гарадоў Беларусі. У ноч на 21 лютага, калі нямецкія войскі яшчэ не ўступілі ў Мінск, Выканкам Першага Усебеларускага з'езда абвясціў сябе вышэйшай уладай – Народным Сакратарыятам. У яго першай "Устаўной грамаце да народаў Беларусі" падкрэслівалася, што "беларускі народ павінен здейсніць сваё права на поўнае самавызначэнне" [5, 105]. Падкрэслім, што ў першыя дні пасля вяртання нямецкіх улад у Мінск іх адносіны з членамі першага беларускага ўрада былі стрыманымі. Хаця па-ранейшаму абсалютная большасць расійскіх гісторыкаў працягвае лічыць, што "у сакавіку 1918 г. германскія акупацыйныя ўлады ўтварылі марыянетачную БНР" [3, 46].

Між тым, 24 лютага германскія ўмовы міру былі прыняты савецкім бокам. Наўрад ці паўнамоцныя прадстаўнікі РСФСР у Брэст-Літоўску ўлічвалі пры гэтым незалежніцкую пазіцыю Народнага Сакратарыята, а вось члены апошняга пачалі з таго моманту адрасаваць свае надзеі да больш мацнейшага на той момант суседа – да Германіі. 28 лютага беларуская дэлегацыя наведала рэзідэнцыю германскай адміністрацыі ў Мінску і выказала лаяльнасць да акупацыйных улад. Рэакцыя акупантаў на прапанову прызнання была адмоўнай, паколькі Беларусь германскі ўрад бачыў "часткай Савецкай Расіі і па Берасцейскаму ўгавору без ураду Леніна гэта пытанне вырашыць не мог" [5, 35]. Нягледзячы на нярэдка гучаўшыя папрокі, што дэлегацыя ад Беларусі нават не прысутнічала пры падпісанні Брэсцкага міру, трэба прызнаць, што ў пачатку сакавіка 1918 г. беларускае прадстаўніцтва ад яшчэ не абвешчанай рэспублікі, ад гэтага не прызнананага ні міжнароднай супольнасцю, ні акупацыйнымі ўладамі ўрада, не мела юрыдычных паўнамоцтваў, каб змяніць умовы прынятага дакумента.

У адпаведнасці з III артыкулам Брэст-Літоўскага мірнага дагавора, падпісанага 3 сакавіка 1918 г. паміж Савецкай Расіяй, з аднаго боку, і Германіяй, Аўстра-Венгрыяй, Балгарыяй і Турцыяй, з другога боку: "Области, лежащие к западу от установленной договаривающимися сторонами линии и принадлежавшие России, не будут больше находиться под её верховной властью, установленная линия обозначена на приложенной карте". Што тычыцца Беларусі, дык яе этнічная тэрыторыя згодна з гэтай картай "была падзелена па лініі Дзвінск – Свянцяны – Ліда – Ружаны – Брэст-Літоўск. Гродзеншчына і Віленшчына адыходзілі да Літвы, якая знаходзілася пад пратэктаратам Германіі (з 11 снежня 1917 г., калі Літоўская Тарыба абвясціла дэкларацыю аб аднаўленні дзяржавы ў саюзе з ёю. – Л.М.) Міншчына, а таксама частка Віцебскай і Магілёўскай губерняў з'яўляліся часова акупаванымі кайзераўскімі вайскамі. Брэстчына з гарадамі Брэст-Літоўск, Кобрын, Пружаны, Драгічын, Лунінец, Пінск і Столін, а таксама Гомельшчына з Гомелем, Рэчыцай і Мазыром адыходзілі да Украіны. Усходнія раёны Беларусі заставаліся ў складзе РСФСР" [7, 4].

Якімі б цяжкімі не былі для беларусаў такія ўмовы міру, яны мелі тэрміновы характар, іх напісанне было вымушаным крокам расійскага ўрада. У той час як РСФСР чакала здзяйснення германскай рэвалюцыі і паражэння Германіі ў Першай сусветнай вайне, Народны Сакратарыят паспрабаваў утварыць рэспубліку. Ва ўмовах, калі тэрыторыя Беларусі была практычна расцягнена па кавалках, 9 сакавіка 1918 г. адбылося абвяшчэнне Беларускай Народнай Рэспублікі, а потым і яе суверэнітэту (25 сакавіка) ў рамках этнічнай тэрыторыі.

29 сакавіка 1918 г. на пасяджэнні Рады БНР была створана камісія міжнародных спраў, якая стала працаваць над апісаннем межаў [6]. За аснову была ўзята этнаграфічная "Карта разсяленія Беларускага племяні" прафесара Я. Карскага, складзеная ў 1917 г. і выдадзеная ў С-Пецярбурзе Расійскай Акадэміяй Навук. Нельга сказаць, што гэтыя намаганні не мелі пад сабою юрыдычнай асновы – існавалі адпаведныя нормы выпрацаванага на той час міжнароднага права, ужо быў вядомы прэцэдэнт падтрымкі Германіяй буржуазнай Украінскай Рады, 23 сакавіка 1918 г. яе ўрад прызнаў незалежнасць Літвы [11, 385], акрамя таго фармальна давала права на самавызначэнне "Дэкларацыя правоў народаў Расіі". Што тычыцца апошняга дакумента, бальшавіцкая партыя паспела даказаць, што нават прадстаўнічы з'езд у колькасці 1872 дэлегатаў не можа дапамагчы ў тым выпадку, калі яго рашэнні супярэчаць праграмным задачам РКП(б).

Спадзяванні Рады БНР на станоўчае вырашэнне беларускага пытання з дапамогай акупацыйных улад, як вядома, не спраўдзіліся. Канчатковы разрыў дыпламатычных сувязей з

Масквой не лепшым чынам паўплываў на далейшую дзейнасць радаўцаў. Між тым тлумачэнні такога выбару заўсёды зводзіліся членамі апальнага ўрада БНР да Брэсцкага дагавору, як быццам бы не Германія, а РСФСР была ініцыятарам яго заключэння. У артыкуле “Лёсы зроблены!” ад 8 красавіка 1918 г. выдатны беларускі дзеяч, прафесар М. В. Доўнар-Запольскі прызнаваўся ў крыўдзе: “Мы не спяшаліся адыйсці ад нашай усходняй сястры, але пецярбургскія правіцелі абрабавалі нашу бедную краіну, не далі ў ёй скласціся праўленню на федэратыўных або аўтаномных пачатках і кінулі нашу Радзіму на волю лёсу” [1, 2]. Ён жа ў маі – кастрычніку 1918 г. у складзе дыпламатычнай місіі БНР у Кіеве вёў перамовы з прадстаўнікамі РСФСР, Украіны, Дона, Германіі, Аўстра-Венгрыі аб прызнанні Беларусі суб’ектам міжнароднага права. Для гэтага па даручэнню ўрада гісторык склаў “Мемуар” (“Асновы дзяржаўнасці Беларусі”), у якім абгрунтаваў неабходнасць гэтага [2], упершыню ўключыў туды этнаграфічную карту Беларусі, пазней прадстаўленую на Парыжскую мірную канферэнцыю.

Калі па пастанове ад 22 чэрвеня 1918 г. Народны Сакратарыят Міжнародных спраў БНР выдаў пад рэдакцыяй Я. Салаўя брашуру “Усходняя Беларусь” (Мінск, 1918), статыстычныя дадзеныя аб тэрыторыі Усходняй Беларусі ў ёй сведчылі, што пераважная колькасць насельніцтва тэрыторый, якія пасля Брэсцкага дагавору апынуліся на баку Расіі мела беларускае паходжанне. “Беларусы маюць веру, што Нямеччына прызнае праклямацыю незалежнасці (24/25сакавіка) і акажа ёй помач у будаванні новага жыцця, прыбавіўшы гэтак сабе ўдзячнага саюзніка” [8]. У сувязі з пераходам ініцыятывы ў вядзенні вайны да краін Антанты, раскол у кіраўніцтве беларускай рэспублікі яшчэ больш паглыбіўся, разгарнулася living рознабаковая знешнепалітычная дзейнасць Міністэрства міжнародных спраў, якое ставіла за мэту прызнанне БНР краінамі свету.

“У адпаведнасці з Дадатковым расійска-германскім дагаворам, падпісаным у Берліне 27 жніўня 1918 г., кайзераўскія войскі павінны былі пакінуць акупаваную тэрыторыю Беларусі на ўсход ад р. Бярэзіны. Адыход германскай арміі пачаўся ў другой палове верасня 1918 г. У вызваленыя раёны ўступала Чырвоная Армія. Так, 31 кастрычніка зноў савецкім стаў г. Магілёў. Да таго часу нямецкія войскі пакінулі Лепельскі і Сенненскі паветы” [7, 5]. У лістападзе 1918 г. буржуазная рэвалюцыя ў Германіі звергла кайзераўскую манархію. 11 лістапада, пасля падпісання перамір’я паміж Антантай і германскім урадам, скончылася Першая сусветная вайна. Па ленінскаму дэкрэту УЦВК ад 13 лістапада 1918 г. усе абавязацельствы Расіі па Брэсцкаму дагавору і ў першую чаргу па тэрытарыяльных уступках і выплаце кантрыбуцыі былі ануляваны. Заключаны і праз восем месяцаў адменены Брэсцкі мір даўно прызнаны несправядлівым і цяжкім для Расіі: акупацыя Германіяй Украіны, Беларусі і Паўночнага Каўказа адрэзала хлебныя раёны, узмацніла разгортванне грамадзянскай вайны ў краіне. З іншага боку, ён даў магчымасць кароткатэрміновай перадышкі для краіны Саветаў. На гэтым гісторыю Брэсцкага міру можна было б і скончыць, калі б не тыя наступствы, якія ён меў.

Па-першае, ён з’явіўся каталізатарам узаемаадносін паміж дзеячамі нацыянальнага руху на Беларусі і савецкім урадам Расіі. Заканчэнне вайны, вяртанне Чырвонай Арміі на вызваленую ад немцаў тэрыторыю, фактычна прадвызначыла канец першай спробе ўтварэння беларускага ўрада.

Па-другое, канчатковае скасаванне пастаноў Брэсцкага дагавору адбылося на Парыжскай мірнай канферэнцыі 1919 г., але далёка не ў карысць Савецкай Расіі і навароджанай БССР. Абмеркаванне на канферэнцыі беларускага, польскага, расійскага і літоўскага пытанняў ва многім паўтарала анэксіённые замахі Германіі, вынікам чаго стала замежная інтэрвенцыя краін Антанты на Усход.

У прыватнасці, літоўская дэлегацыя вылучыла патрабаванне “аднаўлення літоўскай дзяржавы” ў граніцах Віленскай, Ковенскай, Гродзенскай і Сувалкаўскай губерніяў, а таксама асобных раёнаў Курляндыі і Усходняй Прусіі, што закранала інтарэсы беларускага народа.

Адным з пытанняў, якія паўсталі на канферэнцыі, было вызначэнне ўсходняй граніцы Польшчы. Як вядома, абвешчаная ў лістападзе 1918 г. польская дзяржава не мела ўстаноўленай граніцы як на захадзе так і на ўсходзе. Адна з галоўных яе задач заключалася ў тым, каб акрэсліць дзяржаўныя граніцы Польшчы і падабраць дасканалыя факты, каб мірная канферэнцыя згадзілася на ўключэнне беларускіх зямель у склад Польшчы. Для гэтага, на думку новых палітыкаў, трэба было садзейнічаць адрыву ад Расіі прыгнечаных ёю народаў – беларусаў, украінцаў, літоўцаў, латышоў і фінаў.

Найбольш аптымальным варыянтам лічылася аднаўленне "Вялікай Польшчы" ў форме ўніі Польшчы, Літвы, Беларусі і Украіны ў межах 1772 г. Яшчэ да пачатку канферэнцыі вялася перапіска паміж міністрам замежных спраў Польшчы Л. Васілеўскім і народным камісарам Расіі – Г. Чычэрыным. Так, ў ноце ад 30 снежня 1918 г. Л. Васілеўскі абвінавацiў савецкі бок у тым, што Расія праводзіла агрэсіўную палітыку ў адносінах да народаў Літвы і Беларусі і адказала ім у праве распараджацца сваім лёсам [4, 31-34]. Камуністычная рабочая партыя Польшчы 15 студзеня 1919 г. звярнулася да савецкага ўрада з прапановай стварыць камісію з прадстаўнікоў ЦВК КРПП і савецкіх органаў РСФСР, якая пры ўдзеле літоўскіх і беларускіх савецкіх прадстаўнікоў тэрмінова азначыла б граніцу Польшчы. Аднак вызначыць такое пытанне дыпламатычна было немагчыма, таму што адзін і другі бок хацелі бачыць тэрыторыю Беларусі ў сферы свайго ўплыву. Хоць 1 студзеня 1919 г. была абвешчана Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка Беларусь, яна не мела ніякай самастойнасці і кіравалася з Масквы.

Аднак у той час, яшчэ да пачатку работы канферэнцыі, у Вярхоўнага Савета Антанты пасля капітуляцыі Аўстра-Венгрыі і Германіі зараджалася ідэя дэмаркацыйнай лініі, як граніцы Польшчы на ўсходзе. Для яе абмеркавання была створана асобая следчая камісія ў Варшаве, а на тэрыторыю Беларусі, Усходняй Украіны і Літвы былі высланы дэлегацыі для збірання канкрэтнага матэрыялу аб пануючым становішчы у іх польскага насельніцтва, што магло абгрунтаваць тэрытарыяльныя прэтэнзіі Польшчы. Прымаючы за аснову лінію трэццяга падзелу Рэчы Паспалітай, маршал Фош 25 студзеня 1919 г. аддаў загад нямецкім акупацыйным сілам у акрузе Беласток – Гродна аб перадачы палякам тэрыторыі на захад ад лініі Брэст – Нарва – Крынкі – Кузніца – Новы двор – Сапоцкін.

Для вырашэння польскага пытання на канферэнцыі была створана камісія па польскіх справах, якую ўзначальваў француз Ю. Камбон, састаўлены адпаведныя карты, на якіх вызначалася граніца Польшчы, якая ўключала большую частку тэрыторыі Беларусі з Мінскам. Камісія па польскіх справах стварыла падкамісію па пытанню ўсходніх граніц Польшчы, у склад якой уваходзілі Ле Ронд (Францыя, старшыня), Р. Лорд (ЗША), Х. Патан (Вялікабрытанія) і Дэлла Тарэтта (Італія). Падкамісія працавала з 22 сакавіка па 7 красавіка, а 10 красавіка прадставіла справаздачу на пленарным пасяджэнні камісіі па польскіх справах.

На Парыжскай мірнай канферэнцыі прысутнічала і беларуская дэлегацыя. Пытанне аб прысутнасці беларусаў пры падпісанні мірнага дагавора было пастаўлена яшчэ ў канцы 1917 г. на Першым Усебеларускім кангрэсе, за некалькі дзён да пачатку перагавораў у Брэст-Літоўску. Кіраўніцтва БНР дабівалася ўдзелу ў Парыжскай мірнай канферэнцыі, пасылала туды мемарандум, звяртанні, матэрыялы картаграфічнага характару. Першым прадстаўніком урада БНР на канферэнцыі быў Д. Сямашка, які прыбыў у складзе агульнай літоўска-беларускай дэлегацыі ў пачатку 1919 г. Аднак на пасяджэнні "Савета дзесяці" 12 студзеня 1919 г. было вырашана не дапускаць на пасяджэнні канферэнцыі як прадстаунікоў Расіі, так і прадстаўнікоў народаў, якія ўваходзілі ў яе склад на 1 жніўня 1914 г., акрамя Польшчы [9, 31]. Папоўнілася беларуская дэлегацыя ў той час, калі польска-савецкая вайна прывяла да захопу значнай часткі Украіны, Беларусі з г. Вільна – сталіцай Літоўска-Беларускай ССР. 29 красавіка 1919 г. з Берліна ў Парыж выехалі К. Кандратовіч, Азнабішын, А. Баркоў, а ў маі яны сустрэліся з старшынёй канферэнцыі і атрымалі дазвол на прысутнасць беларускай дэлегацыі. Крыху пазней – 25 мая 1919 г. – у сталіцу Францыі прыехала асноўная частка дэлегацыі на чале з А. Луцкевічам, якая прадаставіла мемарандум беларускага ўрада ў эміграцыі з просьбай прызнаць незалежнасць БНР. Аднак гэтае патрабаванне засталося непачутым.

Пазіцыя, якую занялі кіраўнікі канферэнцыі, спрыяла далейшаму разгортванню польскай агрэсіі на беларускіх землях. З аднаго боку, яны прызналі расійскую юрысдыкцыю над Беларуссю ад усходняй межы польскай дзяржавы, якая праходзіла па лініі Гродна – Ялаўка – Няміраў – Брэст-Літоўск. А з другога боку, краіны, якія вызначылі ход канферэнцыі, дапамаглі фарміраванню польскай арміі і не перашкаджалі прасоўванню польскіх войск ва ўсходнім напрамку. Прадказальным аказалася меркаванне, выказанае дзеячом БНР А. Цвікевічам у рабоце "Беларусь", якая была складзена яшчэ ва ўмовах нямецкай акупацыі 1918 г. і выдадзена Надзвычайнай Дыпламатычнай Місіяй БНР ў Берліне (1919 г.): устанаўленне ўлады толькі расійскай ці толькі польскай на тэрыторыі

Беларусі ён тады палічыў малаверагодным: “Более грозна третья альтернатива: раздел Белоруссии на великорусскую и польскую сферу влияний” [10, 3].

Пад час работы Парыжскай мірнай канферэнцыі беларуска-польская граніца так і не была вызначана. У рэшце рэшт 8 снежня 1919 г. старшыня Вярхоўнага Савета Антанты Ж. Клемансо зацвердзіў яе лінію праз Гродна – Ялаўку – Няміраў – Брэст-Літоўск. 3 ліпеня 1920 г. гэта лінія ўвайшла ў гісторыю як “лінія Керзана”. Аднак яе вызначэнне не вырашыла праблемы, паколькі на той час польска-савецкая лінія фронту праходзіла ўздоўж рэк Дзвіны і Бярэзіны. Палякі не змаглі дыпламатычным шляхам даказаць прыналежнасць беларускіх зямель да Польшчы і паспрабавалі ваенным шляхам уваскрасіць Рэч Паспалітую. Беларусь у чарговы раз стала арэнай барацьбы паміж Расіяй і Польшчай, а заключанае пасля польска-савецкай вайны Рыжскае пагадненне 1921 г. мела яшчэ больш цяжкія наступствы для беларусаў, чым Брэсцкі мір.


1. Довнар-Запольский М. В. Жребий брошен! // Цвикевич А. Краткий очерк возникновения Белорусской Народной Республики. – Киев, 1918.
2. Доўнар-Запольскі. Асновы Дзержаўнасці Беларусі. Нарыс. – Городно, 1919.
3. Зубачевский В. А. Политика России в отношении восточной части Центральной Европы (1917-1923 гг.): Геополитический аспект. – Омск: Изд-во ОмГПУ, 2005.
4. Красная книга: Сборник дипломатических документов о русско-польских отношениях в 1918-1820 гг. – М., 1920.
5. Ладысеў У., Брыгадзін П. На пераломе эпох: Станаўленне беларускай дзяржаўнасці (1917-1920 гг.). – Мн.:БДУ, 1999.
6. Мазец В. Межы БНР // Спадчына. – 1993. – № 2.
7. Міхнюк У. М. Першае абвяшчэнне ССРБ: умовы, прычыны, значэнне // Беларускі гістарычны часопіс. – 2004. – № 3.
8. Усходняя Беларусь: статыстычныя і гістарычныя матэрыялы. Рэпрынт выд. – Мн.: друкарня Я. А. Грынблята, 1918. – Мн.: Бел каап. выд. “Адраджэнне”, 1993.
9. Ціхаміраў А. Беларуская праблематыка на Парыжскай мірнай канферэнцыі 1919-1920 гг. // Весці АН Беларусі. Сер. грам. навук. – 1996. – № 6.
10. Цвикевич А. Беларусь: Полит. очерк: Пер. с белорус. – Берлин: Изд. Чрезв. дипломат. миссии Белорус. Нар. Республики, 1919.
11. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 тамах. Т. 4. – Мн.: БелЭн, 1997.